Под руководством преподавателей студенты ведут сбор материалов по различной тематике: «Витебское подполье», «Героическая борьба минских подпольщиков», «Церковь в годы Великой Отечественной войны», «Жизнь и подвиг А. Горовца», «Эскадрилья Нормандия-Неман», «Дети военной поры», «Выдающиеся полководцы Великой Отечественной войны» и др. Хочется привести небольшую выдержку из заключения к реферату Голдабенко А. «Дети военной поры»: «…Я, делая этот проект, поняла, что чувствовали дети во время войны, как повезло нам, не знающим, что такое война. Я не знаю, каково жить в оккупации, вздрагивать от взрывов, сжиматься от ужаса, когда перед тобой дуло вражеского оружия». Такие выразительные, искренние тексты, написанные студентами в виде сочинений, рефератов, дополненные документами, фотографиями, копиями наградных листов, собственными размышлениями несут в себе бесценный воспитательный ресурс.

Таким образом, военная история, особое место в которой занимает Великая Отечественная война, является важным средством патриотического воспитания и способствует укреплению духовных сил молодежи, формированию у нее нравственных ориентиров.

УДК 338.481: 94(476.1)

В. Д. Гайчук, С. В. Мяньчэня

## МЕМАРЫЯЛІЗАЦЫЯ ПАДЗЕЙ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ЛАГОЙШЧЫНЫ І ЯЕ ЎПЛЫЎ НА ТУРЫСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ РЭГІЁНА

Вось ужо 70 год мірнае неба прасціраецца над Беларуссю, аднак мінулая вайна болем адгукаецца ў сэрцы кожнага грамадзяніна нашай Радзімы. Тэрыторыя Лагойшчыны адносіцца да ліку тых мясцовасцей Беларусі, што больш за ўсіх зазналі на сабе акупацыйную палітыку спусташэнняў і генацыду мірнага насельніцтва. Змагаючыся з моцным партызанскім рухам і імкнучыся забяспечыць кантроль над шашой Мінск-Лагойск-Плешчаніцы – Бягомль – Лепель – Віцебск, гітлераўцы фактычна праводзілі тут тактыку “выпаленай зямлі”. З верасня 1941 г. па



Репозиторий БГАТУ

чэрвень 1944 г. яны правялі на Лагойшчыне 11 буйных карных аперацый, падчас якіх было знішчана 85 вёсак, з іх 19 разам з усімі жыхарамі. Так і не былі адноўлены пасля вайны цалкам знішчаныя Альхоўка, Асавіно, Гані, Загор'е, Ідаліна, Мыльніца, Слабада, Трысцень, Тхарніца і вядомыя ва ўсім свеце Хатынь і Дальва, а таксама знішчаныя часткова Баравыя, Баршчэўнік, Беразянка, Іконаўка, Мішкавічы, Новае Заполле, Палеткі, Ставішча і Урупава [1, с. 237]. Усяго за тры гады акупацыі былі расстраляны, павешаны або спалены жывымі 5969 мірных жыхароў Лагойскага (3906 чалавек) і Плешчаніцкага (2063 чалавекі) раёнаў.

У Лагойскім раёне размешчаны дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь», які стаў сімвалам нечалавечай жорсткасці мінулай вайны. На месцы спаленай 22 сакавіка 1943 г. разам з 149 жыхарамі вёскі 5 ліпеня 1969 г. быў адкрыты мемарыял з памяць усіх населеных пунктаў, падзяліўшых лёс Хатыні. За час існавання мемарыяла яго наведалі звыш 36 млн. чалавек са 100 краін свету [2]. Нажаль у наш час колькасць турыстаў і наведвальнікаў скарацілася.

Праз 30 кіламетраў ад Хатыні знаходзілася вёска Дальва, якая была знішчана 19 чэрвеня 1944 года, ўсяго за 10 дзён да вызвалення Плешчаніцкага раёна. Тут загінулі 44 чалавекі: 2 мужчын, 13 жанчын і 29 дзяцей. Выпадкова застаўся ў жывых толькі 13-гадовы падлетак Мікалай Гірыловіч: ён падмяняў бацьку пры выпасе каня. Пахаваць загінулых здолелі толькі з прыходам савецкіх войскаў. Мясцовыя жыхары на магілу паставілі тры драўляныя крыжы розных па вышыні: у памяць старэйшаму, сярэдняму і малодшаму пакаленням. У 1955 г. на месцы брацкай магілы з парэшткамі жыхароў былой вёскі пастаўлены помнік. У 1963 г. яго замянілі на абеліск з пяціканцовай зоркай, а 15 ліпеня 1973 г. тут быў створаны комплекс, які паўтарае планіроўку былой вёскі. У 2009 г. на тэрыторыі мемарыяла створана новая экспазіцыя «Дальва: гераізм, трагедыя, міласэрнасць», дзе сабраны архіўныя фотаздымкі і дакументы, якія распавядаюць пра гісторыю вёскі пачынаючы з канца XVII ст. [2].

Гэтыя аб'екты добра вядомы і наведваюцца турыстамі, аднак на Лагойшчыне знаходзіцца значная колькасць мясцін, якія пакуль не карыстаюцца папулярнасцю. Тэматыку партызанскай барацьбы і трагедыі мірнага насельніцтва працягваюць наступныя населеныя пункты.



Репозиторий БГАТУ

Вёска Свідна Знаменкаўскага сельсавета (9 км ад Лагойска і 18 ад Хатыні), дзе 11 кастрычніка 1943 г. было загублена 98 жыхароў, у тым ліку 39 дзяцей і 11 падлеткаў. На месцы трагедыі у 1974 г. устаноўлены абеліск.

Вёска Косіна, гэтага ж сельсавета. Тут знаходзіцца брацкая магіла савецкіх воінаў, сярод якіх – Ф. Г. Крылоў, Герой Савецкага Саюза, які, будучы воінам 217-га пагранічнага палка, вызначыўся пры вызваленні Лагойшчыны. У крытычны момант бою пайшоў на смерць дзеля выратавання жыццяў сваіх саслужыўцаў, баявых пабрацімаў – узарваў адзінай сваёй гранатай сябе, некалькі фашыстаў і варожы кулямёт, каб не дапусціць прарыву ворага.

Вёска Ніўкі была спалена з усімі жыхарамі 23 чэрвеня 1943 г. але здолела адрадзіцца пасля яе завяршэння. Нацысцкімі карнікамі былі знішчаны 238 з 260 тагачасных жыхароў вёскі, што значна больш, чым лічба, указаная на помніку. Пра трагедыю гэтага населенага пункта вядома з аповядаў некалькіх на той час малых дзяцей, якім цудам удалося выжыць. Успаміны Марыі Сцяпанаўны Богдан увайшлі ў кнігу У.Калесніка “Я з вогненнай вёскі”.

Вёска Дунаі была спалена ў маі 1943 года разам з 48 жыхарамі з 85 і адноўлена пасля вайны. Крыху далей ад яе, непадалёк ад вёскі Гаравец (прыблізна 1 км на ўсход) размяшчалася яшчэ адна спаленая нацыстамі вёска – Трысцень, якую спалілі з часткай жыхароў (35 з 62) фактычна адначасова з Дунаямі і якая, на вялікі жаль, як напамін пра цяжкія гады, не была адноўлена пасля вайны.

У цэнтры в. Янушкавічы, знаходзіцца музей баявой славы, каля якога – мемарыяльны знак на месцы хаты сялянкі Вярбіцкай, адкуль была перададзена міна для знішчэння гаўляйтэра Беларусі Вільгельма. фон Кубэ.

У вёсцы Бабры знаходзіцца магіла партызана С. Куксы, жыхара ур. Рудня, закатаванага, а потым расстралянага разам з сям’ёй (жонкай і маленькай дачкой).

Вёска Ідаліна (1,2 км ад вёскі Кузевічы) у студзені 1943 г. была знішчана з жыхарамі. Загінулі 28 з 60 насельнікаў вёскі, і гэта невялікая вёска ў 10 двароў не змагла адрадзіцца пасля вайны.

На ўсходнім ускрайку вёскі Старое Гарадзішча Акцябарскага сельсавету знаходзіцца магіла 147 ахвяр фашызму, якія былі загублены карнікамі яшчэ напачатку вайны – 23 лютага 1942 г. У 1951 г на месцы гэтай трагедыі быў устаноўлены абеліск.



Репозиторий БГАТУ

Вёска Гані (2,5 км на поўнач ад вёскі Слагавішча). Да вайны ў вёсцы было 18 двароў, дзе пражываў 121 жыхар. У студзені 1944 г. за сувязь з партызанамі і падпольшчыкамі, якім актыўна дапамагалі жыхары вёскі, карнікі знішчылі ўсіх. Палілі і саму в. Слагавішча прыкладна за год да страшэннай трагедыі в. Гані. Тады былі знішчаны ўсе 27 дамоў разам з 61 жыхаром з 145 тых, хто насяляў вёску да вайны. Тыя, хто здолеў выжыць, нанова адбудавалі вёску, аднак не стала яна такой густанаселенай, як да вайны.

Вёска Малыя Бясяды Янушкавіцкага сельсавета звязана з лёсам сям'і Пятра Шайбака. Маючы ўжо 70 год, П. Л. Шайбак стаў у шэрагі партызанскіх сувязных. Разам з бацькам стаў сувязным паміж партызанамі і падпольшчыкамі Мінска сын Міхаіл. Пётр Лукіч зрабіў у павозцы двайное дно і перавозіў зброю для партызан. Калі карнікі палілі Малыя Бясяды, зруйнавалі яны і хутар. Загінулі смерцю храбрых у баі пад Радашковічамі сын П. Л. Шайбака Міхаіл, а таксама на тэрыторыі Лагойскага раёна ўнук Аляксандр (пахаваны ў в. Корань. П. Л. Шайбак памёр на 77 годзе жыцця і пахаваны ў Мінску. Непадалёк ад месца, дзе знаходзіўся хутар Шайбака усталявана памятная пліта "Тут у ліпені 1942 г. быў арганізаваны партызанскі атрад "За Радзіму".

У вёсцы Харошае на мясцовых могілках знаходзіцца ўстаноўлены ў 1974 г. помнік на магіле юнага партызана Генадзя Занько, які загінуў пры выкананні задання камандавання 30 чэрвеня 1944 г. Дзякуючы перададзенаму ім пакету партызаны змаглі перагрупіраваць свае сілы і, дачакаўшыся падмогі ад войск Чырвонай арміі, адбілі атаку немцаў і цалкам разграмілі іх.

Унікальным жывым помнікам вайны з'яўляецца месца пакарання Плешчаніцкіх падпольшчыкаў – сасна з драцяной пятлёй. Надпіс на шыльдзе размешчанай побач гучыць: "Схіліце галовы перад тымі, хто не схіліўся перад акупантамі". Плешчаніцкія падпольшчыкі, у асноўным маладыя хлопцы і дзяўчаты, нядаўнія школьнікі, цаной свайго жыцця набліжалі перамогу: яны ўстанавілі сувязь з партызанамі, кралі ў немцаў зброю, збіралі яе ў месцах баёў, распаўсюджвалі лістоўкі са зводкамі Саўінфармбюро, узарвалі памяшканне жандармерыі.

Ушанавана на Лагойшчыне і памяць аб мясцовым яўрэйскім насельніцтве. У першыя дні акупацыі ў Лагойску было створана гета. 28 жніўня 1941 г. яўрэям старэйшага ўзросту было загадана з'явіцца на цэнтральную плошчу горада. Затым іх пагналі калонай



Репозиторий БГАТУ

за ваколіцу, на лагазінскую дарогу, дзе на схіле ўзгорка прымусілі капаць роў. Людзі палічылі, што яны рыюць акопы. 30 жніўня 1941 г. акупанты сабралі лагайчан яўрэйскай нацыянальнасці ў гарадскім парку і аб'явілі, што павядуць іх на перасяленне ў вёску Гайну. За кіламетр ад Лагойска людзей павярнулі да ўзгорка, загадалі сесці, распрануцца. Канваіры акружылі сабраных кальцом, а ў гэты час падыйшла калона яўрэяў з Гайны, якіх таксама "перасялялі". Няшчасных заводзілі да рова і два нацысты метадычна расстрэльвалі асуджаных на смерць з кулямёта. У той дзень было расстраляна каля 1400 яўрэяў – трэцяя частка даваеннага насельніцтва пасёлка [3]. Гэтае месца мясцовыя жыхары назвалі "Яўрэйскай гарой" ці "Лагойскім Бабім Ярам". Сёння на месцы масавага растрэлу ўсталяваны помнік.

Дадзены спіс мемарыялаў шматпакутнай Лагойшчыны з'яўляецца далёка не поўным, але і па ім можна вызначыць турыстычны патэнцыял раёна. Невялікая адлегласць ад Мінска і трывалая інфармацыйная падтрымка могуць зрабіць Лагойскі раён прывабным месцам для тых, цікавіцца падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Але пакуль большая частка названых вышэй аб'ектаў пазначана толькі на сайце мясцовай раённай адміністрацыі, але пры гэтым без разшыфроўкі легенды [4]. Хацелася б адзачыць, што турыстычнае выкарыстанне мемарыялаў Вялікай Айчыннай вайны павінна несці не камерцыйны, а выхаваўчы змест, служыць напамінам аб тых, хто аддаў сваё жыццё ў гады ваеннага ліхалецця, і аб недапушчальнасці новых трагедый. Чалавек да таго часу жывы, пакуль памятае пра свае карані. Дзеля мінулых і будучых пакаленяў памяць павінна быць захавана.

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННОЙ ЛИТЕРАТУРЫ

1. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Лагойскага раёна. У 2 кнігах. Кн. 1. – Мінск, 2003.
2. Государственный мемориальный комплекс «Хатынь». [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.khatyn.by. Дата доступа: 14.04.2015.
3. Лагойскі "Бабій Яр"//Віртуальны музей горада Лагойска. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://museum.logoysk.info. Дата доступа: 14.04.2015.



Репозиторий БГАТУ

4. Официальный сайт Логойского районного исполнительного комитета. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.logoysk.gov.by. Дата доступа: 14.04.2015.

УДК 171

И. Ф. Романовский

# ВОИН, УЧИТЕЛЬ, ГРАЖДАНИН

*Светлой памяти брата*
*Михаила Федоровича Романовского*

Родился Михаил в деревне Погост бывшего Туровского района бывшей Полесской области, ныне Житковичского района Гомельской области. Он рос в большой крестьянской семье. У его родителей Федора Григорьевича и Марты Лаврентьевны было шестеро детей: он, младший брат Иван и четыре сестры. Старшие помогали отцу и матери по хозяйству, работали вместе с ними в поле, занимались заготовкой сена и т.п. Для них не было понятно, что такое отдых в летние каникулы. Тем не менее, детство, как и юность, было голодным и трудным. Родители преподавали им жизненные уроки терпения и огромного трудолюбия собственным примером: если что-то поручалось делать, надо это выполнить по максимуму. И дети, следуя примеру родителей, не только хорошо работали, но и прилежно учились. В 1941 г. Миша успешно закончил 9-й класс Озеранской средней школы.

Мирный путь Михаила прервался неожиданно – началась война.

Сорок первый… День 22 августа 1941 г. стал черным днем для сельчан и их деревни Погост. Сначала фашисты открыли огонь из появившихся на Припяти бронекатеров. Затем накинулись на деревню, подожгли ее со всех сторон и стали беспощадно убивать всех, кто попадался на пути – женщин, детей, стариков. В их числе оказалась и мать Марта Лаврентьевна. Она выбежала с узелком с пищей для детей из пылающей хаты и сразу же попала под огонь карателей. Тех, кто не успел спрятаться, сгоняли к зданию детских яслей и расстреливали. Убитых стянули в ясли, обложили соломой и подожгли.

Деревня сгорела почти вся, уцелели только одиночные хозяйственные постройки да несколько хат на окраине. Михаил с



Репозиторий БГАТУ